ча (рэж. В.Рубінчык), «Людзі на балоце» І.Мележа (рэж. В.Тураў), «Знак бяды» В.Быкава (рэж. М.Пташук); рус. класікаў: «Бацькі і дзеці» І.Тургенева (рэж. В.Нікіфараў, Дзярж. прэмія СССР 1986). Сучасным праблемам былі прысвечаны фільмы «Нядзельная ноч» (рэж. В.Тураў), «Вазьму твой боль» (рэж. М.Пташук, Дзярж. прэмія Беларусі 1982), «Белыя Росы» (рэж. І.Дабралюбаў), «Мяне завуць Арлекіна» (рэж. В.Рыбараў) і інш.

З канца 1980-х гг. бел. кінематографісты рабілі спробы пераасэнсаваць мінулае сваёй краіны («Наш бронецягнік» і «Кааператыў «Палітбюро», ці Доўгім будзе развітанне», рэж. М.Пташук), звярталіся да «белых пятнаў» гісторыі («...Аз вздам...», рэж. Б.Сцяпанаў, М.Касымава і Б.Шадурскі, «На Чорных лядах», рэж. В.Панамароў, «Птушкі без гнёздаў», рэж. В.Дудзін, «Анастасія Слуцкая», рэж. Ю.Ялхоў). У 2000 выйшлі на экраны маст. фільмы «У жніўні 44-га...» (рэж. М.Пташук), «Зорка Венера» (рэж. М.Касымава), у 2002 —тэлесерыял «Сяброўка Восень» (рэж. К.Капіца). У пач. 2000-х гг. таксама ўбачылі свет дэбютныя работы рэжысёраў І.Паўлава («Свежына з салютам»), І.Волах («Бальная сукенка», сумесна з М.Касымавай), Р.Грыцковай («Маленькія ўцекачы»), аператара П.Крывастаненкі («Яшчэ пра вайну»). У дакум. жанры з'явіліся фільмы «Жылі-былі», «Геній месца» (рэж. Г.Адамовіч), «Андрэевы камяні», «Мы жывём на краі», «Чорнае і белае», «Кола» (рэж. В.Аслюк). У 2007—14 выйшлі фільмы «Шчыт Айчыны» (рэж. Д.Скварцоў), «Чаклун і Румба» (рэж. А.Голубеў), «Дасціш Фантасціш» (рэж. А.Кананові ч), «Трамвай у Парыж» (рэж. Д.Лось), «Навагоднія прыгоды ў чэрвені» (рэж. А.Турава), псіхал. драма «Ваўкі» (рэж. А.Колбышаў), «Брэсцкая крэпасць» (рэж. А.Кот), «Неверагоднае перамяшчэнне» (рэж. А.Анісімаў), «Салодкае развітанне Веры» (рэж. А.Бутор).

На сучасным этапе Нац. кінастудыя прымае ўдзел у рабоце над фільмамі сумеснай вытворчасці, сярод іх «У тумане» (рэж. С.Лазніца), «Роля» (рэж. К.Лапушанскі), «Адзінокі востраў» (рэж. П.Сім), «Я не вярнуся» (рэж. І.Рааг), «Паляванне на гаўляйтара» (рэж. А.Базілаў) і інш.

У 1968 пры к/студыі створана творчае аб'яднанне хранікальна-дакум. і навук.-папулярных фільмаў «Летапіс», у 1973 — студыя мультыплікацыйных фільмаў. За час яе існавання было створана больш за 130 мультфільмаў, аўтарамі якіх з'яўляюцца А.Белавусаў, І.Волчак, У.Голікаў, В.Доўнар, Т.Жыткоўская, У.Кадзюкова, К.Красніцкі, А.Ленкін, Н.Лось, М.Тумеля, А.Турава, Л.Шукалюкоў і інш. У 2013 шляхам рэарганізацыі створана студыя спец. праектаў «Беларускі відэацэнтр».

Вял. ўклад у развіццё бел. кіно ўнеслі акцёры Г.Гарбук, У.Гасцюхін, П.Кармунін, Л.Кміт, У.Крыловіч, Г.Макарава, Т.Мархель, Л.Румянцава, Р.Свярдлова, С.Станюта, В.Тарасаў, Р.Янкоўскі, М.Яроменка-старэйшы; кампазітары У.Алоўнікаў, Ю.Бяльзацкі, Я.Глебаў, І.Дунаеўскі, С.Картэс, А.Рыбнікаў, А.Янчанка; мастакі-пастаноўшчыкі У.Белавусаў, Ю.Булычоў, Я.Ганкін, У.Дзяменцьеў, Я.Ігнацьеў, В.Кубараў, А.Мацвяйчук, У.Чарнышоў, А.Чартовіч; аператары-пастаноўшчыкі Б.Аліфер, А.Аўдзееў, А.Булдзінскі, А.Забалоцкі, Д.Зайцаў, А.Кальцаты, Ф.Кучар, Т.Логінава, Н.Навумаў-Страж, Ю.Марухін, Г.Масальскі, У.Спарышкоў, А.Суханава, Д.Шлюглейт і інш.

**НАЦЫЯНА́ЛЬНАЯ КУЛЬТУ́РА,** культура духоўна з'яднанай, устойлівай тэр., моўнай, сац.-эканам. супольнасці, якая гістарычна выпрацоўвае ўласны стыль жыцця і творчасці. На працягу культурагенезу ўзнікалі і існавалі разнастайныя гіст. тыпы культуры, якія прайшлі істотную трансфармацыю ў сувязі з фарміраваннем нацый у Новы і Найноўшы час і станаўленнем адпаведнага нац. тыпу культуры. Нац. культура ўзнікае на аснове этнічнай, убірае, канцэнтрыруе яе змест, а затым пераўтварае яе ў новую якасць, абапіраючыся на нац. характар і самасвядомасць. Культура нацыі пераймае ад этнічнай культуры здольнасць да стуктураўтварэння самабытных устойлівых стыляў, якія яна імкнецца пастаянна ўзбагачаць. У працэсе трансфармацыі стылю і свайго зместу нац. культура па закене зваротнай сувязі ўносіць пэўныя змены таксама і ў этнічную культуру. Уваходжанне этнасаў у нацыю не азначае засваенне імі ўсёй нац. культуры. Яны толькі часткова ўспрымаюць духоўную культуру нацыі, захоўваючы сваю этнічную культуру. Тым не менш адрозненні паміж сац. групамі ўнутры адной нацыі не распаўсюджваюцца на культ. здабыткі ўсёй нацыі. Агульнасць культуры прысутнічае ў мове, пісьменнасці, сімволіцы, паўсядзённай культуры, звычаях, вераваннях і г. д. Яна ўзбагачае і ўмацоўвае псіхал., інтэлектуальнае, духоўнае адзінства людзей, аб'ядноўвае іх з дапамогай агульнанац. культ. каштоўнасцей і норм, ідэй і ідэалаў. У працэсе сацыядынамікі культура нацыі пераўтвараецца ў сінтэтычны тып культуры, дзе змешваюцца самыя разнастайныя формы інтэграцыі суб'ектаў культуры. Асновай арганізацыі і рэгуляцыі людзей з'яўляюцца інфармацыйна-сімвалічныя складнікі нац. культуры і эфектыўнасць перадачы культ. узораў наступным пакаленням, якая значна павысілася. Фарміраванне бел. нац. культуры адбывалася ў канцы 19 — 1-й чвэрці 20 ст. на хвалі нац.-дзярж. будаўніцтва і культ. адраджэння. У гэты перыяд разгортваўся працэс беларусізацыі, аднаўлення дзяржаўнасці, станаўлення бел. нац. мовы і л-ры, адукацыі, кнігадрукавання, уласнага прафес. выяўл., муз., тэатр. і кінамастацтва, стварэння нац. друку. У суб'ектаў культуры фарміруецца нац. самасвядомасць на аснове ўсведамлення імі свайго агульнага паходжання, адчування са-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

мабытнасці сваёй культуры, мовы, менталітэту. Культура бел. нацыі паступова набывае агульнаслав. і сусв. вядомасць. Характэрнай адметнасцю бел. нац. культуры з'яўляецца яе поліэтнічнасць. У яе ўваходзяць культуры больш за 140 этнічных супольнасцей. Культура тытульнай нацыі (беларусаў) складае структураванае ядро агульнанац. культуры шляхам канвергенцыі і частковай інтэграцыі культур нац. меншасцей.

*Літ.*: Бобков В.Г., Семёнов В.М. Национальное сознание и национальная культура (методологические проблемы). М., 1996; Титаренко Л.Г. Национальная идентичность и социокультурные ценности населения в современном белорусском обществе. Минск, 2006; Науменко Л.И. Белорусская идентичность: содержание, динамика, социально-демографическая и региональная специфика. Минск, 2012.

*А.І.Смолік.*

**НАЦЫЯНА́ЛЬНА-КУЛЬТУ́РНАЯ АЎТАНО́МІЯ**, адна з форм захавання ідэнтычнасці этнічных супольнасцей незалежна ад месца жыхарства шляхам увасаблення розных відаў іх самаарганізацыі ў галіне культуры, асветы і адукацыі; спецыфічная тэорыя і праграма вырашэння міжэтнічных праблем. Зыходзіць з ідэі нац.-персанальнага (паліт.) аўтанамізму, якая распрацавана аўстрыйскімі сацыял-дэмакратамі і была прадстаўлена ў Расіі ў пач. 20 ст. ў 2 варыянтах: нац.-экстэрытарыяльнай аўтаноміі, што прадугледжвала шырокія паліт., эканам., сац. правы для этнасаў, у т.л. для нац. меншасцей у межах будучай федэратыўнай дзяржавы (гэтыя патрабаванні былі характэрны для праграм шматлікіх яўр. паліт. партый); культ.-нац. аўтаноміі, што абмяжоўвала правы этнічных супольнасцей у галіне культуры (падобныя ідэі падзялялі БУНД, інш. сацыял.-дэмакр. партыі). Бальшавікі спачатку выступалі супраць ідэй нац.-персанальнай аўтаноміі (тлумачылі яе як культ.-нац.), лічылі праграмай «буржуазнага нацыяналізму». Тым не менш, пасля перамогі Кастр. рэв. выкарыстоўвалі элементы нац.-персанальнага аўтанамізму ва ўвасабленні нац. камісарыятаў (аддзелаў), фарміраванні нац. саветаў, інш. устаноў нац. характару. Аднак дагматычнае тлумачэнне прынцыпаў інтэрнацыяналізму, боязь т.зв. рэцыдываў нацыяналізму абумовілі скасаванне шматлікіх устаноў, што займаліся нац. праблемамі. Пасля распаду СССР, узнікнення нац. незалежных дзяржаў на постсав. прасторы, абвастрэння міжнац. супярэчнасцей прымусілі дзярж. кіраўнікоў, шматлікіх палітыкаў зноў звярнуцца да ідэй нац.-персанальнага аўтанамізму, увасобленых цяпер у ідэі Н.-к.а. Рэспубліка Беларусь стала адной з першых сярод незалежных дзяржаў постсав. прасторы, якая пачала ўвасабляць ідэі Н.-к.а. У ліст. 1992 Вярх. Савет Рэспублікі Беларусь прыняў Закон «Аб нацыянальных меншасцях». Змяненні і дапаўненні ў Закон былі ўнесены Нац. сходам Рэспублікі Беларусь у студз. 2004 і маі 2007. Закон гарантуе нац. меншасцям права на карыстанне роднай мовай, захаванне сваёй гісторыка-культ. і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культуры, а таксама права на стварэнне ўласных аб'яднанняў. Шэраг таварыстваў і аб'яднанняў нац. меншасцей з'явіліся ў канцы 1980-х гг. У 1991 былі ўтвораны татарскае, яўр., азербайджанскае, карэйскае аб'яднанні, у 1992 — рус., малдаўскае, у 1994 — літоўскае. Асн. мэтамі і задачамі гэтых аб'яднанняў сталі задавальненне этнакульт. запросаў і запатрабаванняў этнасаў. Гэта знайшло адлюстраванне ва ўзнікненні школ выхаднога дня. Да 2004 у краіне было арганізавана 65 школ для прадстаўнікоў армянскай, азербайджанскай, грузінскай, грэч., яўр., карэйскай, латышскай, літоўскай, малдаўскай, польск., ням., татарскай і ўкр. нацыянальнасцей, у якіх навучаліся да 5 тыс. удзельнікаў. Увасабленню ідэй Н.-к.а. садзейнічала стварэнне ў 1994 Рэсп. цэнтра нац. культур, у задачы якога ўваходзілі аказанне арганізацыйна-метадычнай і практычнай дапамогі нац.-культ. аб'яднанням і т-вам у Беларусі, грамадскім аб'яднанням за мяжой. У краіне жывуць прадстаўнікі каля 140 нацыянальнасцей, дзейнічаюць 212 грамадскіх арг-цый і іх філіялаў 26 нацыянальнасцей. За межамі краіны пражывае каля 3 млн. бел. суайчыннікаў, выхадцаў з Беларусі і іх нашчадкаў, імі створана звыш 280 грамадскіх аб'яднанняў. Цэнтр арганізуе фестывалі, канцэрты, умацоўвае міжнац. згоду на бел. зямлі, садзейнічае стварэнню умоў для практычнай рэалізацыі правоў грамадзян, незалежна ад этнічнай прыналежнасці. Рэгулярна у г. Гродна праводзіцца рэсп. фестываль нац. культур. У Рас. Федэрацыі ў чэрв. 1996 быў прыняты Закон «Аб нацыянальна-культурнай аўтаноміі», у якім Н.-к.а. тлумачыцца як экстэр. грамадскае фарміраванне, самакіруемае грамадскае ўтварэнне ў месцах кампактнага пражывання нац. і этнічных супольнасцей. З дапамогай розных форм нац.-культурнага самавызначэння грамадзяне Рас. Федэрацыі незалежна ад тэрыторыі пражывання здзяйсняюць свае шматлікія правы, у т. л. атрымліваць падтрымку з боку органаў дзярж. улады, мясц. самакіравання і прадстаўляць свае нац.-культурныя інтарэсы. У 1999 пры актыўным удзеле Пасольства Рэспублікі Беларусь у Рас. Федэрацыі ўтворана Федэральная нац.-культурная аўтаномія «Беларусы Расіі». У яе складзе — 11 рэгіянальных і 20 мясц. арг-цый, 3 абл. нац.-культ. цэнтры, 5 музеяў бел. спадчыны і больш за 20 нефармальных аб'яднанняў.

*У.Я.Казлякоў.*

**НАЦЫЯНА́ЛЬНАЯ МО́ВА**, 1) сродак зносін пэўнай нацыі, які склаўся гістарычна і выкарыстоўваецца ва ўсіх магчымых грамадскіх функцыях на дадзеным храналагічным этапе. 2) Сукупнасць усіх фаналагічных, лексічных, граматычных форм і варыянтаў мовы, якія выкарыстоўваюцца пэўным этнасам незалежна ад узроўню культуры, адукацыі,

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ